УДК 947.6+930.1(476)

А.М. Дулаў

# Становішча жанчыны ў БССР 1920-30-х гг.: беларуская гістарыяграфія

У 20-30-я гг. XX ст. пад уплывам дзяржаўнай палітыкі адбываліся значныя змены ў становішчы жанчыны ў савецкім грамадстве, у тым ліку ў саюзных рэспубліках. Пачынаючы з 1920-х гг. гэтыя змены станавіліся аб'ектам увагі беларускіх даследчыкаў. Адзіна магчымай метадалагічнай базай даследаванняў беларускіх гісторыкаў з'яўляўся марксізм. Тэарэтыкі марксізму лічылі, што эмансіпацыя жанчын і сапраўднае раўнапраўе могуць быць дасягнутыя толькі праз вызваленне іх ад гнёту сям'і і хатняй гаспадаркі, і ўцягненне ў вытворчасць і грамадскае жыццё. Гэтая ўстаноўка паўплывала як на палітыку бальшавікоў, так і на выбар праблематыкі савецкімі даследчыкамі, і на высновы, якія імі рабіліся.

1920-я гг. былі азнаменаваны, у першую чаргу, распаўсюджаннем на Беларусі прац марксісцкіх тэарэтыкаў вырашэння жаночага пытання (А. Бебеля, А. Калантай і інш.) і з'яўленнем публікацый прапагандысцкага характару, у якіх тлумачылася бальшавіцкая палітыка, утрымліваўся факталагічны матэрыял аб удзеле жанчын ў вытворчасці і грамадскім жыцці [1-3]. Безумоўна, звяртае на сябе ўвагу праца вядомага філосафа, сацыёлага С. Вальфсона «Социология брака и семьи» (1929). Аўтар стаяў на пазіцыях «матэрыялістычнай генеаноміі», для якой было характэрна імкненне прасачыць сувязі шлюбна-сямейнай арганізацыі з грамадскім ладам і ўстанавіць сацыяльную заканамернасць у развіцці сям'і і шлюбу. У апошнім раздзеле даследавання С. Вальфсон на ўзроўні тагачаснай сусветнай навукі, але і пад уздзеяннем бальшавіцкіх установак, аналізуе ўплыў сацыяльна-эканамічных працэсаў на шлюбна-сямейныя адносіны, каханне, сексуальнасць у савецкім грамадстве 1920-х гг., якое вызначае як пераходнае ад капіталізму да сацыялізму. Навуковец лічыць, што ў сямейна-шлюбнай арганізацыі адбіліся шматлікія супярэчнасці пераходнага перыяду: «В ней скрещиваются правовое равенство женщины с ее пониженной трудовой квалификацией; выдвижение государством женщины на политическую арену с массовой общественно-политической отсталостью ее; ростки нового быта переплетаются с традиционным закрепощением женщины власти домоводства... высвобождение сексуальных отношений из-под власти экономического расчета и проституирование этих отношений; острая неудовлетворенность молодежи формами брачно-семейной организации и напряженные, подчас беспорядочные, поиски новых форм взаимоотношения полов» [4]. Гэтыя супярэчнасці пазбаўляюць сям'ю ўстойлівасці і трываласці. Аўтар прытрымліваецца традыцыйнага для марксістаў меркавання, што ў сацыялістычным грамадстве сям'я перастане існаваць, а шлюб стане саюзам індывідуальнага кахання, вызваленага ад усіх «шлакаў разліку» [4, с. 445- 447].

У 30-я гг. з усталяваннем таталітарызму даследаванні праблемы становяцца рэалізацыяй партыйнага заказу на навуковае абгрунтаванне пастулату аб поўным вырашэнні «жаночага пытання» у СССР. Яскравым

прыкладам крайне тэндэнцыйнага, апалагетычнага падыходу з'яўляецца раздзел «Женщина в Стране Советов» з кнігі С. Маліміна і Я. Ракава [5]. Змены ў становішчы жанчыны ў савецкім грамадстве трактуюцца аўтарамі як адназначна пазітыўныя.

У канцы 1950-х гадоў з'яўляюцца сур'ёзныя навуковыя працы, напісаныя на беларускім матэрыяле, у якіх даследчыкі зрабілі спробы аналізу удзелу жанчын у савецкім будаўніцтве 1920-30-х гг. Гэта былі кандыдацкія дысертацыі А. Захватаевай і В. Сарокінай. Гісторыкі выкарысталі шырокае кола архіўных крыніц, перыёдыку, а таксама статыстычныя зборнікі. Кастрычніцкая рэвалюцыя трактавалася аўтарамі як ключавая падзея ў гісторыі жанчын, якая стварыла ўмовы для іх вызвалення, у ліку іншых працоўных, ад усіх відаў і формаў эксплуатацыі [6, 7]. Дысертацыя А. Захватаевай была прысвечана ролі беларускіх работніц у вытворчасці і ў грамадска-палітычным жыцці ў часы другой пяцігодкі. Гісторыкам сцісла характарызуецца бальшавіцкае «жаночае» заканадаўства, стварэнне і дзейнасць жанаддзелаў, месца жанчыны ў прамысловасці 1920-х гг. З дапамогай пераважна статыстычнага метаду, даследчыца паказвае павелічэнне, пад уплывам дзяржаўнай палітыкі, удзельнай вагі жанчын у прамысловасці ў перыяд з 1933 па 1937 гг., павышэнне імі кваліфікацыі, удзел у стаханаўскім руху, рост актыўнасці ў грамадскім і дзяржаўным жыцці. Аўтар падкрэслівае, што павышэнню вытворчай і грамадскай актыўнасці жанчын паспрыялі рост іх палітычнай свядомасці, а таксама стварэнне шырокай сеткі ўстаноў грамадскага харчавання, дзіцячых садкоў і ясляў [6, с. 12, 14]. А. Захватаева сцвярджае, што ў разглядаемы перыяд, работніца з'яўлялася ініцыятыўным творцам новага жыцця. Як і іншыя савецкія гісторыкі, аўтар не імкнецца выявіць адмоўныя бакі бальшавіцкай палітыкі і праблемы ў становішчы жанчыны.

Праца В. Сарокінай прысвечана характарыстыцы ролі сялянкі ў грамадска-палітычным і культурным жыцці беларускай вёскі ў т. зв. «аднаўленчы перыяд» (1921-1925). Даследчыца характарызуе дзейнасць жанаддзелаў на вёсцы, падкрэслівае вялікую ролю дэлегацкіх сходаў у барацьбе з прыніжанасцю жанчыны. Яна адзначае, што «общественная работа делегаток расширяла их общий кругозор и воспитывала из них активных борцов за социализм. Она на практике разбивала дикий предрассудок, будто женщина не способна к активной общественной деятельности, и что ее удел – лишь семья и дети» [7, с. 9]. Удзел сялянак у органах кіравання (праца ў сельскіх і цэнтральных саветах, выканкамах), а таксама павышэнне іх актыўнасці у грамадскіх арганізацыях (кааперацыі, камітэтах сялянскай узаемадапамогі), партыі і камсамоле паказваюцца як на статыстычным матэрыяле, так і праз аналіз дзейнасці асобных актывістак [7, с. 15]. В. Сарокіна адзначае наяўнасць у сялянскім асяроддзі таго, што сёння мы б назвалі партыярхатнымі стэрэатыпамі. Сярод фактараў, якія перашкаджалі вызваленню сялянак ад «старога быта», аўтар указвае, па-першае, працідзеянне кулацтва і пэўнай часткі кансерватыўна настроенага сялянства, якое выражалася нават у збіцці дэлегатак і актывістак; па-другое, недавер да жанчын, меркаванне, быццам бы жанчына не здольная ўдзельнічаць у грамадскім жыцці [7, с. 16]. У заключэнне даследчыца робіць абгрунтаваны вывад, што «хотя в массе своей крестьянки еще не были активными общественницами, для того периода привлечение партией сравнительно большого актива женщин деревни к управлению страной было большим достижением» [7, с. 16]. Дысертацыя В. Сарокінай, на наш погляд, з'яўляецца адным з лепшых беларускіх даследаванняў савецкіх часоў. Для яе характэрны даволі высокі ўзровень аналізу разглядаемых з'яваў і пэўная самастойнасць у высновах.

У 1960-1980-я гг. жаночая праблематыка разглядаецца у кандыдацкіх дысертацыях, абароненых па спецыяльнасці «гісторыя КПСС». Калі ў папярэдніх працах аналізавалася дзейнасць саміх жанчын пад кіраўніцтвам партыі, то тут

увага сканцэнтраваная на вывучэнні формаў і метадаў працы партыйных органаў сярод жанчын. Так, у дысертацыі М. Дзюбаковай разглядаецца дзейнасць КПБ па ўцягненню жанчын у прамысловасць і грамадска-палітычнае жыццё ў 1926-1932 гг. [8], у дысертацыі М. Партновай – прыцягненне іх да калгаснага будаўніцтва [9]; Т. Бабкова прааналізавала дзейнасць КПБ па развіццю грамадска-палітычнай актыўнасці жанчын у аднаўленчы перыяд [10]. Структурна названыя даследаванні нагадваюць працы А. Захватаевай і В. Сарокінай. Характар іх пераважна апісальны. Палітыка бальшавікоў увогуле і канкрэтныя яе мерапрыемствы, накіраваныя на вырашэнне жаночага пытання, характарызуюцца як адзіна верныя і выключна эфектыўныя. Адмоўныя моманты гэтай палітыкі (узмацненне двайной занятасці ў выніку ўцягвання жанчын ў прамысловасць, дыскрымінацыя іх у аплаце працы, трагедыі сем'яў рэпрэсаваных і г.д.) і негатыўная рэакцыя жанчын замоўчваліся.

У 1950-1980-я гг. вышэйназванымі гісторыкамі былі апублікаваны артыкулы ў навуковых зборніках і часопісах, прысвечаныя як гісторыі савецкай жанчыны, так і палітыцы бальшавікоў першых дзесяцігоддзяў Савецкай улады [11-12]. У 1962 г. выйшла кніга А. Захватаевай, створаная на аснове дысертацыі, якая так і засталася адзіным больш-менш сур'ёзным манаграфічным даследаваннем праблемы становішча жанчыны ў беларускім грамадстве 1920-30-х гг. [13]. Трэба адзначыць зборнік артыкулаў і успамінаў «В борьбе и труде» [14], падрыхтаваны у Інстытуце гісторыі партыі пры ЦК КПБ. Навукова-метадалагічны ўзровень зборніка даволі нізкі (матэрыял не сістэматэзаваны, падаецца не ў храналагічным парадку), аднак ён утрымлівае цікавыя звесткі пра грамадска-палітычную дзейнасць беларускіх жанчын у 1920-я гг. Акрамя таго быў выданы шэраг прапагандысцкіх брашур, прысвечаных савецкай жанчыне [15-16]. Асобныя аспекты праблемы закраналіся ў абагульняючых працах і манаграфіях беларускіх гісторыкаў, вывучаўшых перыяд 1920-30-х гг. [17-18].

Паўсядзённасць, быт, прыватная сфера жыцця людзей савецкіх гісторыкаў не цікавіла. Гэтыя праблемы разглядаліся этнографамі. Трансфармацыі ў сферы быту і шлюбна-сямейных адносінаў 1920-х гг. былі ахарактарызаваны ў кандыдацкай дысертацыі А. Камарова [19]. Змены ў сялянскай сям'і ў першыя дзесяцігоддзі Савецкай улады закранаюцца ў калектыўнай працы «Сям'я і сямейны быт беларусаў» (1990) [20]. Аўтар адпаведнага раздзелу Г. Курыловіч сцвярджае, што пасля рэвалюцыі «зацвердзілася раўнапраўе жанчын як у сям'і, так і грамадстве»[20, с. 102], шлюбы заключаліся сялянамі на аснове кахання, матэрыяльны бок тут ролі не адыгрываў. Развод быў больш характэрны для гарадскіх сем'яў, сельскія адрозніваліся стабільнасцю [20, с. 103]. У раздзеле «Гарадская сям'я», напісаным Л. Ракавай, перыяд 1920-30-х гг., на жаль, адлюстравання не знайшоў.

1990-я гг. з'явіліся якасна новым этапам у развіцці гістарычнай навукі Беларусі, адзначаным пошукамі выхаду з метадалагічнага крызісу і пераглядам пэўных догмаў і стэрэатыпаў савецкай навукі. У рэспубліцы, як і на ўсёй постсавецкай прасторы, пачынаюць развівацца даследаванні ў галіне тэорыі і практыкі фемінізму, жаночай гісторыі, гендэрнай гісторыі, што стварае новыя магчымасці для вывучэння становішча жанчыны ў грамадстве Савецкай Беларусі. Першы крок у гэтым накірунку быў здзейснены Ірынай Чыкалавай. У дакладзе на міжнароднай канферэнцыі «Нацыянальна-гістарычныя вытокі жаночага руху на Беларусі: мінулае і перспектывы» (Мінск, 17 снежня 1996 г.), аналізуючы ролю жанчыны ў палітыцы, даследчыца закранула праблему ўзаемаадносін улады і жанчыны ў БССР. І. Чыкалава ўпершыню ў беларускім навуковым дыскурсе выкарыстала тэрмін «гендэр», які растлумачыла як «сацыяльную арганізацыю палавых адрозненняў», «...культуралагічную характарыстыку паводзін, якая адпавядае полу ў дадзеным грамадстве ў

дадзены час». [21, с. 232]. Праблема атрымала далейшую распрацоўку ў артыкулах І. Чыкалавай і У. Навіцкага [22-24]. Аўтары звярнулі ўвагу не толькі на станоўчыя, але і на негатыўныя змены ў становішчы беларускай жанчыны ў 1920-1930-я гг.: узмацненне двайной занятасці і маскулінізацыя ў сувязі з уцягненнем у вытворчасць, больш нізкая кваліфікацыя і, адпаведна, ўзровень заработнай платы, фармальнае прадстаўніцтва жанчын у органах улады і г. д. Даследчыкі прыйшлі да высновы, што палітыка бальшавікоў была скіравана не столькі на жаночую эмансіпацыю, колькі на прыцягненне жанчын да вырашэння задач пэўнага моманту сацыялістычнага будаўніцтва. Практыка вырашэння жаночага пытання ў СССР, на думку І. Чыкалавай, «з'явілася адной з самых вытанчаных гістарычных містыфікацый» [21, с. 222]. Некалькі артыкулаў, пераважна архівазнаўчага характару, прысвечаныя беларускай сялянцы 20-х гг. і перыяду калектывізацыі, былі апублікаваны І. Курковым [25-27]. Аўтар звярнуў увагу на шэраг важных момантаў, напрыклад, на антыкалгасныя выступленні сялянак. Цікавым прыкладам выкарыстання феміністкай метадалогіі з'яўляецца тэкст А. Гапавай [28], у якім даследчыца зрабіла спробу прасачыць сувязь паміж «жаночым пытаннем» і фарміраваннем нацыянальнай суб'ектнасці ў БССР і Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд.

Такім чынам, пачынаючы з 1920-х гг. беларускімі навукоўцамі быў створаны шэраг прац, закранаўшых гісторыю жанчыны ў беларускім савецкім грамадстве 1920-30-х гг. У савецкі час пэўныя поспехі былі дасягнутыя ў распрацоўцы праблем дзейнасці жанаддзелаў, уцягнення жанчын ў прамысловую вытворчасць і грамадска-палітычнае жыццё, павышэння іх культурнага ўзроўню. Аднак безальтэрнатыўнае панаванне марксісцкай метадалогіі і, асабліва, партыйны ідэалагічны кантроль не дазвалялі даследчыкам наблізіцца да рознабаковай і аб'ектыўнай характарыстыкі становішча жанчын. Багаты факталагічны матэрыял выкарыстоўваўся, звычайна, для доказу ідэалагічна зададзеных вывадаў. Савецкая палітыка ў адносінах да жанчыны ідэалізавалася, замоўчваліся звязаныя з ёю адмоўныя моманты, праблемы ў становішчы жанчыны ў грамадскай і прыватнай сферах. Многія тэмы, якія актыўна распрацоўваліся на Захадзе, у савецкай навуцы лічыліся маргінальнымі. Так па-за ўвагай даследчыкаў знаходзіліся праблемы, звязаныя з жаночым вопытам, жаночым успрыняццем рэчаіснасці, жаночай цялеснасцю, сексуальнасцю. У другой палове 1990-х гг. беларускія гісторыкі зрабілі спробы разгледзіць становішча жанчыны ў Савецкай Беларусі з новых тэарэтыка-метадалагічных пазіцый, аднак абагульняючае ўсебаковае даследаванне, прысвечанае перыяду 1920-1930-х гг., на сённяшні дзень адсутнічае. Стварэнне яго ўяўляецца неабходным і актуальным.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Калыгіна А.С.*** Правы работніц і сялянак у СССР. Мн., 1926. – 62 с.
2. ***Танаевцева Н.*** Что надо знать работнице о профсоюзах. Изд. 2-ое, испр. Мн., 1927. – 62 с.
3. ***Маліноўскі Л.*** Жанчына і абарона. Мн., 1929. – 32 с.
4. ***Вольфсон С.Я.*** Социология брака и семьи. Мн., 1929. – 474 с.
5. ***Малинин С.Н., Раков Я.Н.*** Рост материального и культурного уровня трудящихся БССР. Мн., 1939. С. 83-99.
6. ***Захватаева Е.Н.*** Производственная и общественно-политическая деятельность женщин Советской Белоруссии в годы второй пятилетки (1933-1937 гг.) Автореф. дисс... канд. ист. наук. Мн., 1958. – 23 с.
7. ***Сорокина В.В.*** Роль женщины-крестьянки в общественно-политической и культурной жизни белорусской деревни в восстановительный период (1921-1925 гг.). Автореф. дисс... канд. ист. наук. Мн., 1958. – 17 с.
8. ***Дюбакова М.Г.*** Борьба Коммунистической партии Белоруссии за вовлечение женщин республики в промышленность и общественно-политическую деятельность (1926-1932 гг.). Автореф. дисс... канд. ист. наук. Мн., 1961. –18 с.

9. *Портнова М.С.* Деятельность Компартии Белоруссии по вовлечению женщин деревни в колхозное строительство (1929-1934 гг.). Автореф. дисс... канд. ист. наук. Мн., 1972.–24 с.
10. *Бобкова Т.Г.* Деятельность КПБ по развитию трудовой и общественно-политической активности женщин в восстановительный период (1921-1925 гг.) Автореф. дисс... канд. ист. наук. Мн., 1983. – 20 с.
11. *Сорокина В.* Вовлечение женщин-крестьянок в общественно-политическую жизнь белорусской деревни в восстановительный период (1921-1925 гг.) // Ученые записки Минского педагогического института им. А.М. Горького, 1957. в.VIII. С. 23-47.
12. *Бабкова Т.Г.* З гісторыі дзейнасці Камуністычнай партыі Беларусі па паляпшэнню дабрабыту і ўмоў працы жанчын рэспублікі (1921-1925) // Веснік Беларускага універсітэта імя У.І. Леніна. Сер. Гісторыя. Філасофія. Навуковы камунізм. Эканоміка. Права, 1979, № 1. С. 6-9.
13. *Захватаева А.* Жанчыны Беларусі – будаўнікі камунізма. Мн., 1962. – 207 с.
14. *В борьбе и труде.* Сборник / Под ред. *Т. Дмитриевой.* Изд. 2-ое, доп. и перераб. Мн., 1977. – 287 с.
15. *Ус А.П.* Што дала Кастрычніцкая рэвалюцыя жанчынам Беларусі. Мн., 1958. – 40 с.
16. *Юк З.М.* Женщины Белоруссии – активные строители коммунизма. Мн.,1982.–18 с.
17. *Герасименко Г.Г.* Деятельность Компартии Белоруссии по вовлечению трудящихся масс в управлении государством (1925-1937). Мн., 1975. С. 43-48.
18. *Каменская Н.В.* Становление народного образования Белоруссии (1917-1920). Мн., 1980. С. 216-248 і інш.
19. *Комаров А.М.* Новые явления в общественном и семейном быту трудящихся Советской Белоруссии (1917-1929 гг.). (Историко-этнографический очерк). Автореф. дисс... канд. ист. наук. Мн., 1969.
20. *Сям'я і сямейны быт беларусаў / В.К. Бандарчык, Г.М. Курыловіч, Л.В. Ракава* і інш. Мн., 1990. – 253 с.
21. *Чыкалава І. Жанчына: суб'ект ці аб'ект палітыкі ?* // Полымя, 1997. № 6. С. 221- 232.
22. *Чикалова И.Р., Ковтун В.М., Новицкий В.И.* Женщины Беларуси в исторической ретроспективе // Женщины Беларуси в зеркале эпохи. Национальный отчет. Мн.: Представительство ООН / ПРООН в Республике Беларусь, 1997. С. 14-25.
23. *Чикалова И.* Белорусские женщины между «общественным» и «частным» в годы советской власти // Иной взгляд: Международный альманах гендерных исследований. Мн., 2000. Май. С. 14-17.
24. *Навіцкі У.* Жанчына ў савецкім грамадстве: Новы погляд на праблему // Штогоднік Інстытута гісторыі НАН Беларуси. Мн., 1999. С. 93-109.
25. *Куркоў І.* Жанчыны Беларусі «эпохі калектывізацыі» у дакументах ЦК КП(б)Б // ARCHE, 1999, № 3. С. 213-217.
26. *Курков И.* Гендерный строй белорусской деревни в 20-е гг. // Иной взгляд: Международный альманах гендерных исследований. Мн., 2000. Март. С. 25-26.
27. *Курков И.* Беларусь 1920-х: диалог власти с «пробудившейся» крестьянкой // Иной взгляд. Мн., 2000. Май. С. 17-19.
28. *Гапова Е.* Между войнами: женский вопрос и национальные проекты в Советской Белоруссии и Западной Беларуси // Гендерные истории Восточной Европы. Сб.науч. статей / Под ред. *Е. Гаповой, А. Усмановой и А. Пето.* Мн., 2002. С. 100-123.

## *S U M M A R Y*

*The Soviet and post – Soviet Belarussian historiography of the status of woman in BSSR in the 1920-30s is analysed in the article. The author draws a conclusion that the predominance of marxist methodology and the ideology dictate significantly limited the researches of Soviet historians. For the last years the attempts to look at the problem from new methodological positions have been made in the articles of Belarussian historians but a generalizing all-round research is missing at present.*

*Поступила в редакцию 4.03.2001*